# Лідскі скарб XVII ст. з фондаў Нумізматычнага кабінета Нацыянальнага музея ў Варшаве

Раман КРЫЦУК



Член ГА «Беларускае нумізматычнае таварыства», Рэспубліка Беларусь, г. Мінск, e-mail: Kola.Sonca@gmail.com

Анжэй РАМАНОЎСКІ



Нацыянальны музей у Варшаве, Кабінет манет і медалёў, галоўны захавальнік, Рэспубліка Польшча, г. Варшава, e-mail: aromanowski@mnw.art.pl

У фондах Нумізматычнага кабінета Нацыянальнага музея ў Варшаве захоўваецца частка скарбу з 314 манет, знойдзеных у г. Лідзе Гродзенскай вобласці. Правенанс дадзенага комплексу наступны. Ён быў выяўлены ў 30-я гг. XX ст. (да 1939 г.?) на тэрыторыі прадмесця горада падчас выкопвання катлавана для падмурка будынка. Дэпазіт ляжаў у керамічнай тары на глыбіні 1,5 метра і складаў каля 1 000 манет. Спачатку ён быў падзелены паміж асобамі, якія яго знайшлі, на тры роўныя часткі. Верагодна, што ў 1940-я гг. адзін з іх (Eugeniusz Pilewicz) пераехаў на пастаяннае пражыванне ў Польшчу. У 1954 г. яго частка скарбу была прададзена (?) Археалагічнаму Музею ў Варшаве, адкуль у 1958 г. яе перадалі (?) у Нацыянальны музей у Варшаве. У выніку блытаніны ў дакументацыі і адсутнасці больш дакладнай інфармацыі распавесці падрабязней пра лёс дэпазіту складана. Пры гэтым інфармацыя пра знаходку не трапіла ў тагачасныя газеты[1]. Першапачаткова комплекс захоўваўся пад нумарам (numer spisowy) 5715/41, сучасны інвентарны нумар (NPO) – 210270-210584.

### Склад захаванай часткі скарбу

Склад захаванай часткі скарбу наступны: 304 манеты Рэчы Паспалітай, 6 манет Расійскага Царства, 2 манеты герцагства Прусія, 1 манета Шведскіх Інфлянтаў і 1 манета Іспанскіх Нідэрландаў. Большая частка манет Рэчы Паспалітай адносіцца да выпускаў Яна II Казіміра Вазы (1649–1668) (290 шэлягаў і 10 шастакоў), акрамя таго, 4 манеты адбіты пры Яне III Сабескім (1676–1696). Асноўную частку комплексу складаюць каронныя і літоўскія малыя медныя шэлягі Яна II Казіміра Вазы, вядомыя яшчэ як «баратынкі». Іх дакладнае апісанне і вызначэнне былі зроблены згодна з працай Цэзарыя Вольскага [1] і змешчаны ў выглядзе *табліц 1* і *2*. Акрамя шэлягаў, прадстаўленых у *табліцах 1* і *2*, адна манета з'яўляецца бракаванай, гэта т. зв. інкузны брак з рэльефнай і люстэркавай выявамі аверса. Вызначэнне іншых каронных і літоўскіх манет адбывалася згодна з працамі Эдмунда Капіцкага [2; 3], для рускіх манет выкарыстоўвалася сумесная праца І. Грышына, У. Клешчынава і А. Храмянкова [4].

Меншай падборкай прадстаўлены шасціграшовікі Яна II Казіміра Вазы (NPO 210560-210570). Апісанне каронных манет прыведзена ў *табліцы 3*.

Акрамя каронных шастакоў прысутнічае адзін літоўскі, адбіты ў 1666 г. на віленскай менніцы (NPO 210565, Kop. Monety WKL 600, Kop. 3623;

[1] *Аўтар выказвае падзяку за інфармацыю і кансультацыі лідскаму краязнаўцу Леаніду Лаўрэшу.*

Табліца 1

**Барацінкі літоўскія**

| 1660 | 1661 | 1663 | 1664 | 1665 | 1666 | 16XX | Фальшывыя манеты |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 4 (Уяздаў) | 9 (Уяздаў) | 5 (Аліва) | 14 (Вільня) | 1 (Берасьце) | 19 (Берасьце) | 6 (Берасьце) | 8 недатаваных, адна тыпу «конь з доўгімі нагамі» *(малюнкі 1 і 2)* |
| | | | | 17 (Вільня) | 33 (Вільня) | 21 (Вільня) | |
| | | | | 2 (Коўна) | 2 (Коўна) | 6 (Коўна) | |
| | | | | | 4 (Мальбарк) | 11 (неатрыбутаваныя) | |
| | | | | | 4 (неатрыбутаваныя) | | |

Табліца 2

**Барацінкі каронныя**

| 1660 | 1661 | 1663 | 1664 | 1665 | 166X | 16XX | Фальшывыя манеты |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 6 | 7 | 20 | 27 | 13 | 7 | 28 | 1660 г., 1663 г., 1664 г.; 11 недатаваных *(малюнак 3)* |

Табліца 3

**Каронныя шасціграшовікі Яна II Казіміра Вазы**

| Год | 1662 | 1665 | 1666 | 1667 | Не вядомы |
|---|---|---|---|---|---|
| Колькасць | 1 | 1 | 3 | 4 | 1 |
| Нумар каталога | Кор. 1661 *(малюнак 4)* | Кор. 1678? | Кор. 1679 | Кор. 1680<br>Кор. 1686 (2 адз.)<br>Кор. 1693 | ? |



*Ян II Казімір. Падробка пад літоўскую барацінку (NPO 210370)*

**Малюнак 1**



*Ян II Казімір. Падробка пад каронную барацінку (NPO 210556)*

**Малюнак 3**



*Ян II Казімір. Падробка пад літоўскую барацінку, тып «конь з доўгімі нагамі» (NPO 210402)*

**Малюнак 2**



*Ян II Казімір. Шостак 1662 г. Менніца Кракава (Кор. 1661; NPO 210560)*

**Малюнак 4**

*малюнак 5*). У невялікай колькасці прадстаўлены эмісіі Яна III Сабескага. Гэта 4 шасціграшовікі, адбітыя на менніцы Быдгашча ў 1683 г. (Кор. 1963; 1964) і 1684 г. (2 адз., Кор. 1968; *малюнак 6*).

Асобна выдзяляецца рыжскі шэляг (NPO 210577; *малюнак 7*) 163X г. Густава II Адольфа Вазы (1611–1632). Звычайна такія манеты складаюць невялікую частку (5–15%) у дэпазітах з шэлягамі Шведскіх Інфлянтаў. Апошнія паступова знікаюць са скарбаў ужо ў другой палове 60-х гг. XVII ст. Але з-за таго, што мы маем магчымасць апрацаваць толькі частку скарбу, складана сказаць, адносілася манета да дадзенага комплексу ці трапіла ў яго склад выпадкова, напрыклад падчас захоўвання скарбу асобай, якая яго знайшла. Трэба заўважыць, што з тэрыторыі Беларусі вядомы як мінімум адзін падобны па характары дэпазіт, які таксама ўтрымлівае ў сваім складзе адзін шэляг Густава II Адольфа Вазы [5, с. 136]. Рускія манеты (NPO 210578-83) прадстаўлены невялікай і самай маладой часткай у выглядзе 6 дротавых капеек Пятра I (1696–1725). Дзве манеты адбіты на кадашоўскай менніцы (1702 г., КГ 1862 і 1919), рэшта – на старой маскоўскай менніцы (2 адз., XXXX г., КГ?; 2 адз., 1700 г., КГ 1631 і 1640; *малюнак 8*). Да манет герцагства Прусія адносяцца тры трохграшовікі (NPO 210575-210576; *малюнак 9*), адбітыя пры Фрыдрыху III (1688–1701) на менніцы Краляўца ў 1696 г. Адна манета (NPO 210584; *малюнак 10*) адносіцца да эмісій Іспанскіх Нідэрландаў. Гэта недатаваная $^{1}/_{4}$ патагона штатгальтэра і суправіцеля правінцыі



*Густаў II Адольф, Шведскія Інфлянты. Шэляг 163X г. Менніца Рыгі (NPO 210577)*

***Малюнак 7***



*Пётр I. Расійскае Царства. Капейка 1700 г. Старая маскоўская менніца (КГ 1640; NPO 210580)*

***Малюнак 8***



*Ян II Казімір. Шостак 1666 г. Менніца Вільні (Кор. Monety WKL 600; Кор. 3623; NPO 210565)*

***Малюнак 5***



*Фрыдрых III. Герцагства Прусія. Тры грошы 1696 г. Менніца Краляўца (NPO 210575)*

***Малюнак 9***



*Ян III Сабескі. Шостак 1684 г. Менніца Быдгашча (Кор. 1968; NPO 210573)*

***Малюнак 6***



*Штатгальтэр і суправіцель правінцыі Альберт VII Аўстрыйскі і Ізабэль Клара Эўхенія. Іспанскія Нідэрланды, правінцыя Брабант. $^{1}/_{4}$ патагона (1598–1621). Менніца Бруселя (NPO 210584)*

***Малюнак 10***

Альберта VII Аўстрыйскага і Ізабэль Клары Эўхеніі (1598–1621 гг. эмісіі), адбітая на менніцы г. Бруселя правінцыі Брабант.

### Час захавання комплексу і аналогіі

Самыя маладыя манеты ў складзе разглядаемай часткі скарбу з'яўляюцца рускімі дротавымі капейкамі Пятра I і адначасова сведчаць аб часе захавання скарбу ў перыяд Паўночнай вайны (1700–1721). На жаль, падрабязныя працы, якія асвятляюць гісторыю Ліды ў кантэксце Паўночнай вайны, адсутнічаюць. Вядома, што ў ходзе баявых дзеянняў горад быў спустошаны і спалены шведскімі войскамі [6]. У некаторых працах згадваецца неаднаразовае рабаванне горада: у 1702 г., 1706 г. і 1708 г. [7; 8]. Таксама падчас гэтых падзей быў моцна пашкоджаны Лідскі замак [9]. Куды лепш даследаваны скарбы, захаваныя ў перыяд Паўночнай вайны, і дэпазіты з рускай манетай. Ёсць цэлы шэраг публікацый, якія разбіраюць і адзінкавыя комплексы, выяўленыя выпадкова [5; 10] ці падчас археалагічных прац [11], і знаходкі з пэўных рэгіёнаў [12]. Акрамя таго, беларускі нумізмат В.А. Кабрынец, што даследуе пытанні абарачэння рускай дротавай манеты на тэрыторыі Беларусі, напісаў грунтоўны абагульняючы артыкул, у якім разглядаюцца як абставіны прыходу дротавых капеек на грашовы рынак Рэчы Паспалітай, так і ўсе вядомыя знаходкі скарбаў з імі [13]. Па яго меркаванні, руская дротавая манета стала актыўна трапляць на тэрыторыю Беларусі пасля 1704–1705 гг., калі рускія войскі пачалі інтэнсіўна ўдзельнічаць у баявых дзеяннях на тэрыторыі Рэчы Паспалітай [13, s. 227]. Такім чынам, лідскі комплекс хутчэй за ўсё мог быць захаваны падчас знішчэння горада шведамі ў 1706 г. ці 1708 г. Акрамя таго, гэты скарб з'яўляецца самым заходнім знойдзеным на тэрыторыі Беларусі дэпазітам з рускай дротавай манетай Пятра I.

***Бібліяграфічны спіс:***

*1. Wolski, C. Miedziane szelągi Jana Kazimierza Wazy z lat 1659–1667 / C. Wolski. – Lublin, 2016. – 528 s.*

*2. Kopicki, E. Ilustrowany skorowidz pieniędzy polskich i z Polską związanych. 1506–1795 / E. Kopicki. – Warszawa: PTN, 1995. – T. 1. – 657 s.*

*3. Kopicki, E. Monety Wielkiego Księstwa Litewskiego 1387–1707 / E. Kopicki. – Warszawa: PTN, 2005. – 136 s.*

*4. Гришин, И.В. Каталог русских монет от Ивана Грозного до Петра Великого / И.В. Гришин, В.Н. Клещинов, А.В. Храменков. – Изд. 2-е. – М., 2021. – 880 с.*

*5. Кобринец, В.А. Клад с русскими «проволочными» копейками из Витебска (находка 1971 г.). / В.А. Кобринец // Віцебскія старажытнасці: матэрыялы навуковых канферэнцый. – Мінск, 2013. – С. 134–136.*

*6. Краўцэвіч, А.К. Ліда / А.К. Краўцэвіч // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыклапедыя / Бел. Энцыкл.; рэдкал.: В.В. Гетаў [і інш.] – Мінск: БелЭн, 1993. – С. 367–368.*

*7. Краўцэвіч, А.К. Ліда / А.К. Краўцэвіч // Археалогія Беларусі: энцыклапедыя: у 2 т. / рэдкал.: Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2011. – Т. 2: Л–Я. – С. 15.*

*8. Баравы, Р. Ліда / Р. Баравы // Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя: у 2 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 2006. – Т. 2: Кадэцкі корпус – Яцкевіч. – С. 197.*

*9. Трусаў, А.А. Лідскі замак / А.А. Трусаў // Археалогія Беларусі: энцыклапедыя: у 2 т. / рэдкал.: Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2011. – Т. 2: Л–Я. – С. 16.*

*10. Кабрынец, В.А. Скарб з рускімі манетамі з-пад вёскі Строчыцы Мінскага раёна / В.А. Кабрынец // Studia Numismatica Albaruthenica; уклад. В.М. Сідаровіч, М.А. Плавінскі. – Мінск, 2011. – Вып. 1. – С. 115–126.*

*11. Иов, О.В. Клад из Несвижа в контексте событий Северной войны / О.В. Иов // Pieniądz i wojna. Białoruś, Litwa, Łotwa, Polska, Słowacja, Ukraina: materiały z VI Międzynarodowej konferencji numizmatycznej, Supraśl, 9–11 września 2004 r. – Warszawa, 2004. – S. 177–178.*

*12. Кобринец, В.А. Монеты России в кладах Витебщины / В.А. Кобринец // Віцебскія старажытнасці: матэрыялы навуковых канферэнцый. – Мінск, 2013. – С. 37–40.*

*13. Кобринец, В.А. «Проволочные» копейки Петра I Алексеевича в кладах Беларуси первой четверти XVIII в. / В.А. Кобринец // Pieniądz i systemy monetarne wspólne dziedzictwo Europy. Studia i materiały. Białoruś – Bulgaria – Litwa – Łotwa – Mołdawia – Polska – Rosja – Rumunia – Słowacja – Ukraina: materiały z X Międzynarodowej konferencji numizmatycznej, Supraśl, 19–22 września 2012 r. – Warszawa, 2012. – S. 224–236.*

## The Hoard of Lida of the XVII Century from the Funds of the Numismatic Cabinet of the National Museum in Warsaw

**Raman KRYTSUK,** *Member of the NGO "Belarusian Numismatic Society", Republic of Belarus, Minsk, e-mail: Kola.Sonca@gmail.com.*

**Anzei ROMANOWSKI,** *National Museum in Warsaw, The Department of Coins and Medals, Chief Curator, Republic of Poland, Warsaw, e-mail: aromanowski@mnw.art.pl.*

**Abstract.** *The article examines and analyzes coins from the treasure of the XVII century, which was found during excavations in Lida in the interwar period. Currently, a third of the deposit is in the funds of the National Museum in Warsaw. The youngest coins in the treasure include Russian wire kopecks of Petr I (1696–1725) and at the same time testify to the time of preservation of the treasure during the Great Northern War (1700–1721).*